# Цікавы летапіс

**У аддзеле рэдкіх кніг Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага захоўваецца каля 500 выданняў**

Зала рэдкіх выданняў адкрыта пры аддзеле краязнаўства бібліятэкі год назад. Тут сабрана паўтысячы ўнікальных кніг XIX — пачатку XX стагоддзя на рускай, польскай, англійскай, нямецкай і французскай мовах.

Тут захоўваецца найбольш поўная калекцыя "Агляда ў Гродзенскай губерні" (1878—1913 гг.), у якіх прадстаўленыя матэрыялы аб жыцці і дзейнасці губерні і яе паветаў. Выданні падагульнялі звесткі па рэгіёне за год, адлюстроўвалі дэмаграфічную, адміністрацыйна-юрыдычную, эканамічную абстаноўку, узровень добраўпарадкавання і медыцынскага абслугоўвання і інш. Так, з "Аглядаў" можна даведацца, што ў 1878 годзе ў Гродзенскай губерні было ўсяго 63 ўрачы, а ў 1913-м — ужо 205.

Каштоўным набыткам з'яўляюцца матэрыялы першага ўсеагульнага перапісу Расійскай імперыі 1897 года па Гродзенскай губерні (Санкт-Пецярбург, 1904 г.). Згодна з гэтым выданнем, роднай мовай жыхары губерні таго часу называлі рускую, беларускую, украінскую, польскую, чэшскую, літоўскую, нямецкую, цыганскую і нават фінскую.

У фондзе бібліятэкі ёсць кніга вядомага гродзенскага гісторыка і краязнаўцы, супрацоўніка "Гродзенскіх губернскіх ведамасцяў" Уладзіміра Манасеіна "Сялянскае пытанне ў Гродзенскай губерні ў XIX стагоддзі" (1902 г.). У фондах аддзела можна знайсці ўнікальныя звесткі аб сферы адукацыі на Гродзеншчыне ў канцы XIX стагоддзя — "Кароткая справаздача аб стане Гродзенскай мужчынскай гімназіі за 1981—1892 навучальны год, складзеная выкладчыкам Г. Харламповічам" (1893 г.).